Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №1(52), 2009

*УДК 808.26–085.3*

# Адметнасць ужывання пытальных сказаў у паэтычным тэксце

В. А. Ляшчынская

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У паэтычным тэксце шырока распаўсюджана ўжыванне пытальных сказаў, але пры гэтым яны маюць рад адметнасцей свайго выкарыстання. Найбольш пашыранай і прыкметнай адметнасцю ўжывання пытальных сказаў у паэзіі з'яўляецца іх нанізванне, ці паўтор, і ў такім разе можна гаварыць аб паўторы пытальных сказаў як адным са сродкаў паэтычнага сінтаксісу. Ён як бы дапаўняе ці выяўляе на сінтаксічным узроўні ключавую адметнасць паэзіі ўвогуле, паколькі менавіта паўтор з'яўляецца пачаткам усіх узроўняў і аспектаў паэтычнага маўлення: націскных і ненаціскных галосных у вершаваным радку, страфе, вершы; паўтор эквівалентных радкоў і іх камбінацый у страфе; паўтор тэматычных і ключавых слоў, граматычных формаў; паўтор кампазіцыйных элементаў і інш. Паэтычная форма заснавана на прынцыпе паўтору, які дазваляе "выціскаць усе сокі з маўлення" [1, с. 46].

Пры такім ужыванні пытальных сказаў яны нясуць рытарычна-ўзмацняльны характар, да таго ж аказваюць і перадаюць надзвычай моцнае эмацыянальнае ўздзеянне, што істотна адрознівае іх ад пытанняў, напрыклад, у вусным маўленні. Спецыфічнасць пытанняў у лірыцы вызначаецца адрасатам (таго, да каго звернута пытанне; таго, хто ведае адказ; таго, хто здольны на хуткі адказ) і сэнсавым кантэкстам. Так, адрасат можа быць, паводле тэрміналогіі І.І.Каўтуновай, знешні і ўнутраны [2, с. 128]. Знешні – чытач, унутраны – той, да каго звяртаецца паэт, паколькі паэт заўсёды адрасуе свой твор, каб выказацца, "паставіць пытанне", хаця даследчыкамі прызнаецца, што "лірычныя пытанні ў большасці выпадкаў не разлічаны на адказ" [2, с. 129]. М.М. Бахцін у сувязі з адрасатам мастацкага твора заўважае нават аб наяўнасці "нейкай вышэйшай інстанцыі разумення ў адказ, якая можа адсоўвацца ў розных накірунках" [3, с. 498].

Даследуючы мову паэзіі Янкі Купалы і, у прыватнасці, пытанні-паўторы, намі адзначаецца наступнае істотнае адрозненне ўжывання ў паэзіі пытанняў-паўтораў – наяўнасць розных тыпаў паводле адрасата. Так, пытальныя сказы адрасуюць маўленне паэта да чытача, уяўнага субяседніка, любога і кожнага, як, напрыклад, у вершы "Чалавеку", дзе ўжо загаловак называе адрасата, да якога звяртаецца паэт, і дзе першыя чатыры страфы пабудаваны на аснове нагнятання пытанняў. Вось толькі першая страфа:

*Ці ты чуеш, як стогне віхура,*
*Як старой хаткі сцены дрыжаць,*
*Як у коміне вые панура,*
*Як сукі ў боры цёмным трашчаць?..* ("Чалавеку", ІІІ, с. 102) [4].

Ужываючы пытанні-паўторы, нярэдка ў некалькіх, як правіла, суседніх строфах, паэт адрасуе ўнутранае маўленне да сябе – тады гэта дыялог паэта з сабой – і разам з тым да субяседніка, да цэлага свету, як, напрыклад, у вершы "Дзе?..", загаловак якога – пытальнае прыслоўе, дзе пяць строф аформлены ў выглядзе пытанняў. Вось толькі першыя дзве:

*Дзе ты, хатка, дзе сялібка,*
*Родны мой куточак,*
*Што мне даў бы скаратаці*
*Рэшту дзён і ночак?*

*Дзе загон зямелькі чорнай,*
*Дарагая ніва,*
*Што дала б мне нацяшацца*
*З залатога жніва?* ("Дзе?..", ІІІ, 37),

ці ў наступным вершы, які зноў жа мае аднатыпны загаловак з першым пытаннем-сказам першай страфы і пачынаецца трыма пытальнымі сказамі, што выступаюць зачынам:

*Дзе ты, шчасце маё, дзе ты, светлая доля?*
*За што сэрца гняце жалю дзікая змора?..*
*Выйду цёмнай парой гэт за вёску на поле*
*І падслухаю сціха, што ночка гавора.* (“Дзе ты, шчасце маё?..”, III, 100).

У стане найвышэйшага ўзрушэння тым, што адбываецца вакол, што выклікае такое ўзрушэнне, паэт адрасуе сваё маўленне, ужываючы паўтор пытальных сказаў, да Бога, звяртаецца да “вышэйшай інстанцыі” паразумення яго, як у вершы “Цару неба й зямлі”, вызначаючы і характарызуючы ўжо ў назве адрасата “вышэйшую інстанцыю”, да якой апелюе паэт, выяўляючы тым самым непакорнасць, нязгоду, нязвычнасць паводзін пакорнага чалавека:

*За што, о Божа праведны, магучы,*
*Караеш так няшчасны свой народ?*
*Чаму на стогн маўчыць Твой гром бліскучы,*
*На стогн, што да Цябе йдзе з году ў год?*

*За што над намі даў перамаганне*
*Табою створанай бядзе і цьме,*
*Спладзіўшы быт сірочага канання*
*Сынам і іхняй матцы-старане?* (“Цару неба й зямлі”, III, 85).

Яшчэ адной асаблівасцю ўжывання пытанняў-паўтораў у паэтычным тэксце з’яўляецца іх разнастайнасць не толькі паводле адрасата, але і функцыі, якую яны выконваюць, хаця нярэдка і ў сувязі з адрасатам.

Сярод розных, але характэрных і адметных для паэзіі з’яўляецца медытацыйная функцыя, калі пытанні служаць сродкам перадачы разважанняў паэта. Так, 8-ая, заключная, частка верша “Аб мужыцкай долі” пабудавана ў выглядзе паўтору аднолькавай структуры пытанняў-разважанняў (першая частка – уласна пытанне з анафарычным пытальным словам *нашто,* а другая – іранічны адказ), сэнс якіх так зразумелы ў кантэксце твора:

*Нашто хлеб, нашто багацце,*
*Калі нам мякіны хваце?*
*Нашто боты, чаравікі,*
*Калі ёсць лаза і лыкі?*
*Нашто век зямлі хацелі?*
*Памром – сажань будзем меці!*
*Нашто новыя нам хаты?*
*Казна, двор і так багаты.*
*Нашто свет навукі шчаснай,*
*Калі слёзы свецяць ясна?*
*Нашто лек на гора болькі,*
*Калі маем манапалькі?*
*Нашто знаці ўсяго многа?*
*І так трапім да астрога!* (III, 136).

Пытанні ставяцца для ўсведамлення свету, прыроды, сутнасці жыцця, прызначэння чалавека. Ампліфікацыя пытальна-рытарычных сказаў у спалучэнні з іншымі відамі паўтораў (фанетычным, лексічным, сінтаксічным) уздымае этычныя разважанні паэта да вяршынь паэтычнага аратарскага майстэрства. У якасці яшчэ аднаго прыклада прывядзем верш “Перад бурай”:

*Што бачу? – ўсё спіць пад няславай...*
*Ці ж праўда? – няўжо гэта вораг асіліў?*
*Няўжо ўсе байцы за народную справу*
*Тыранамі зможаны, леглі ў магілу?*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Няўжо ўвесь народ упаў гэтак нікчэмна*
*І даўся без голасу дэспату ў рукі?*
*Няўжо дух свабоды, дух сілы мяцежнай*
*Замёр і не ўскрэсіш ніякай прынукай?*

*Ці ж мала няшчасцяў, ці ж мала слёз мора?*
*Ці ж мала кайданаў, мучэнняў не ў меру?*
*О, не! Штосьці сэрца іначай гавора, –*
*Я гэтакай цішы не веру, не веру!*

*Так толькі бывае прад летняю бурай –*
*І птушка замрэ, й пагляд сонца нясмелы,*
*На небе ж збіраюцца хмура за хмурай,*
*І гром заграхоча, і дрогне свет цэлы!* (“Перад бурай”, I, 137).

Пытанні, акрамя пытальнага значэння, характарызуюцца наяўнасцю пэўнай у іх інфармацыі, што дае падставы выдзеліць *інфармацыйную функцыю.* Адносна інфармацыйнага зместу пытанняў у звычным маўленні даследчыкі заўважаюць, што “пытанне з’яўляецца носьбітам пэўнай інфармацыі”, пры гэтым адзначаюць, што яна складае толькі зыходны пачатак, ці перадумову, а не асноўны яго змест і таму прадстаўлена ў пытанні ў “згорнутай” логіка-граматычнай форме. Асноўны ж змест сказа з пытальнай інтанацыяй – гэта ўказанне на недастатковасць, няпэўнасць ці непаўнату гэтай зыходнай інфармацыі і гнасеалагічную патрэбу ў яе папаўненні” [5, с. 266]. Пытанне, такім чынам, утрымлівае дваякую інфармацыю: зыходную інфармацыю пра свет і ўказанне на яе недастатковасць і неабходнасць далейшага папаўнення. У паэтычным творы змест пытання значна адрозніваецца сваёй інфармацыяй, паколькі, па-першае, яно не патрабуе адказу, г. зн. не ставіць мэту папаўнення інфармацыі. Нават у выпадку, калі на пытанне і даецца адказ, як, напрыклад, у вышэйцытаваным вершы “Аб мужыцкай долі”, то гэта не столькі для папаўнення зыходнай інфармацыі пытання, колькі і хутчэй за ўсё спосаб яе прэзентацыі. Па-другое, пытанне і асабліва цэлы рад іх падаюць інфармацыю, асвятляюць, “ставяць пэўнае пытанне” наяўнай інфармацыяй у форме пытання з мэтай актуалізаваць успрыманне яе, уздзейнічаць на чытача, што і падмацоўваюць прыклады з паэтычнай творчасці Купалы, дзе паўторы пытанняў у паэтычных тэкстах выяўляюць не толькі зыходную, колькі важнейшую інфармацыю, больш за тое, яны інфармуюць ёю свайго адрасата, а семантычная частка логікі пытання атаясамліваецца з яго зыходнай інфармацыяй, пытанне ўтрымлівае пэўную і найбольш важную інфармацыю. Выразным прыкладам ужывання такога тыпу пытанняў можа служыць верш Янкі Купалы “Брату ў чужыне”, у якім усе 10 строф складаюцца з пытанняў. Вось толькі першая страфа:

*Ці помніш ты, нядбалы дружа,*
*Ўсё тое, дзе радзіўся, ўзрос?*
*Дзе напявае зімка стужай,*
*Ірдзіцца лета бліскам рос?*(“Брату ў чужыне”, II, 111-112).

І ў астатніх строфах ужываюцца пытанні, якія не патрабуюць адказу, бо іх функцыя – паведамленне: яны інфармуюць адрасата, брата ў чужыне, напамінаюць яму аб розных праявах яго жыцця на Беларусі.

Ужыванне паўтору пытанняў спрыяе падкрэсліванню, выдзяленню асноўнай думкі верша, сутнасці яго зместу і такім чынам выконвае *сэнсава-выдзяляльную функцыю.* Як правіла, ужыванне пытанняў-паўтораў у такой функцыі вядзе да своеасаблівай пабудовы твора, выконваючы такім чынам тэкстаўтваральную функцыю. Так, верш “Да моладасці” пачынаецца пытаннем:

*Ты скажы, скажы,*
*Мая моладасць,*
*Што дала ты мне,*
*Сыну хамскаму?* (“Да моладасці”, II, 12).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

На гэтае пытанне далей ідзе адказ у радзе строф (дала сілу, адарыла працавітасцю “дый услужнасцю і пакорнасцю”), а заканчваецца двума пытаннямі:

*Адно, доля, дзе,*
*Скажы, моладасць?*
*Чаму волю даць*
*Ты забылася?* (“Да моладасці”, II, 12),

якія і выражаюць асноўны змест гэтага паэтычнага твора: ёсць усё, што патрэбна для жыцця, акрамя долі і волі.

З інфармацыйнай цесна звязана *градацыйная функцыя, экспрэсіўна-эмацыянальная,* калі рад пытанняў у творы стварае напружанасць шляхам выкарыстання прыёму градацыі, markнабакова асвятляючы ўзнятую праблему і выражаючы накал пачуццяў. Так, у вершы “На службе” лірычны герой, скардзячыся на свой лёс, на “ненавісную службу – прыгон”, ставіць рад пытанняў-паведамленняў:

*Ці нядзелька, ці свята мне ёсць,*
*Ці як людзі гуляў я калі,*
*Ці ў мяне пагасціў добры госць,*
*Ці мне добрае слоўца далі?*(“На службе”, I, 117).

Пытальныя сказы, іх нагнятанне ў паэтычным тэксце служыць выкананню *эматыўнай функцыі*, калі менавіта пытанні перадаюць эмоцыі, душэўны стан паэта ці яго лірычнага героя. Нярэдка яны інфармуюць пра гэта і заклікаюць адрасата да разважання, да роздуму, да ўспамінаў і пад. Вось некалькі прыкладаў пытанняў-паўтораў з розных вершаваных тэкстаў:

*Божа! гэткі свет тут*
*Моц стварыла твая!*
*Дзе ж мой дом, дзе мой люд?*
*Дзе айчызна мая?*

*Дзе той час, у яком*
*Тут кіпела жыццё?*
*Свой народ быў кругом*
*І любіў сваё ўсё.* (“Над сваёй Айчызнай”, I, 89);

*Дык каму ж, каму*
*Гулка запяю?*
*Хто паслухае*
*Песню-жаль маю?*

*Перад кім, ой, кім*
*Расчыню душу?*
*Стогн бяды, нуды*
*Ў думках заглушу?* (“Гэй, ты, сэрцайка...”, I, 184).

Менавіта пытанне, вынесенае ў загаловак твора, і рад пытанняў у пачатку яго як своеасаблівы зачын верша – гэта градацыя для выражэння накалу пачуццяў, як, напрыклад, у наступным выпадку, калі загаловак верша – адно з пытанняў, вынесенае з першага радка:

*Дзе ты, шчасце маё, дзе ты, светлая доля?*
*За што сэрца гняце жалю дзікая змора?* (“Дзе ты, шчасце маё?..”, III, 100).

Адной з функцый выкарыстання пытанняў-паўтораў у паэтычным тэксце варта лічыць *размоўна-стылявую функцыю*, калі ў мастацкім творы імітуецца сітуацыя жывога маўлення. Напрыклад, у вершы “Не чапайся, панічок!..” паўтор, нагнятанне некалькіх няпоўных сказаўпытанняў стылізуе маўленне “мужыцкай дачкі”, якая знаходзіцца ў стане гневу, раздражнення, здзіўлення і інш., што падкрэслівае і графічнае спалучэнне пытальніка з клічнікам, дзе пытальная інфармацыя суправаджаецца эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай:

*Не чапайся!.. Што з табой?*
*Стой!.. Куды?.. Што чыніш?!* (“Не чапайся, панічок!..”, I, 139).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Блізкай да папярэдняй – імітацыя жывога маўлення і разам з тым адметнай з’яўляецца *функцыя альтэрнатывы*, калі паўтараюцца пытанні-меркаванні з рознай ступенню ўпэўненасці, якія даюць выбар ці прапануюць адрасату выбраць з іх магчымы адказ. Такі тып пытанняў-паўтораў ў паэтычных творах Янкі Купалы адзначаецца надзвычай часта. Напрыклад, у адным з вершаў, прысвечаных роздуму аб месцы і ролі, ацэнцы яго паэтычнай творчасці чытачамі, паэт выяўляе ў пытаннях два кантрастныя варыянты:

*А ўсё ж як тамка сваякі-суседзі*
*Яе* [песню – В.Л.] *поймуць, хацелася бы знаць, –*
*Ці блаславяць, ці ўтопчуць гідка ў гразь?* (“Для Бацькаўшчыны”, IV, 27).

Нярэдка такія пытанні выступаюць зачынам верша, як, напрыклад, у адным з вершаў пад назвай “Думка”, які пабудаваны ў выглядзе імітацыі размовы двух суразмоўнікаў. Верш пачынаецца з пытання-альтэрнатывы аднаго з іх, задаючы адзін з магчымых кірункаў адказу для другога:

– *Эх, мой братка, эх, мой родны,*
*Што так спахмурнеў:*
*Ці ты збіўся з пуцявіны,*
*Ці саўсім не меў?..* (“Думка”, II, 37).

Затым ідуць ад 2-ой да 6-ай строфы-адказы аб жыцці, беспрасвецці яго, а ў 6-ай – адказ-супакаенне таго, хто пытаецца:

– *Не сумуй, брат! Бліснуць зоры,*
*Шчасця ўскрэснуць дні;*
*Долі, волі ўзойдзе кветка*
*Са слёз і крыві!* (“Думка”, II, 37).

Гэта можа быць разважанне, унутраны маналог лірычнага героя, перад якім стаіць выбар:

*Што рабіць у такім тут жыцці, бяспуцці –*
*Выйсці цэлым з пятлі, не палезці наўрад:*
*Ці жаніцца цяпер і ў салдаты ісці,*
*Ці жаніцца тады, як вярнуся з салдат?..* (“За чаркай”, II, 21) і інш.

Спецыфіку ўжывання пытальных сказаў складае іх набор, паўтор пытальных сказаў у залежнасці ад іх месца ў страфе, творы, у выніку чаго яны могуць служыць розным мэтам. Так, пералік іх у пачатку твора, ці зачын верша, – гэта выражэнне ўнутранага адрасаванага маўлення. Напрыклад, верш “Восень” пачынаецца наборам пытанняў:

*Эй, восень, восень,*
*Скуль ты ўзялася?*
*Песняй няўдалай*
*Так разляглася?* (“Восень”, I, 228),

а далей ідуць апісанні бедаў, няшчасцяў і разважанні старога і лірычнага героя аб жыцці.
Ужыванне пытанняў у канцы верша – гэта вынік, своеасаблівае рэзюме твора, як, напрыклад, у вершы “З табою....”, апошняя страфа якога выяўляе галоўнае, складае асноўную думку твора – няпэўнасць выбару свайго шляху жыцця:

*Пуціна была, мы і тую*
*Згубілі, як лепей – не зналі:*
*Ці маем шукаці старую,*
*Ці к новай блукаціся далей?* (“З табою...”, III, 20).

А выкарыстанне пытання-рэфрэну, дакладней, паўтору аднаго і таго ж пытання ў канцы кожнай страфы верша ці яго часткі, – гэта акцэнтацыя ўвагі, падкрэсліванне і выдзяленне асноўнага. Напрыклад, у 4-ай частцы верша “Аб мужыцкай долі” канцавым радком кожнай з трох строф, у якіх расказваецца пра непасільную працу “з дня на дзень, з году ў год” народа ў полі, у лесе, на будаўніцтве, выступае пытанне “Што ж здабыў за жыццё?”:

*За сахой, бараной,*
*За сярпом і касой*
*З дня на дзень, з году ў год*
*Слёзы, пот лье народ,*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*А за гэта за ўсё*
*Што здабыў за жыццё?*(“Аб мужыцкай долі”, III, 132).

Паўтор пытальных сказаў, іх набор можа складаць частку твора, як у вершах Янкі Купалы “Град”, “Сяўцу”, “Ах, ці доўга…”, “Да сваіх думак”, “Ворагам Беларушчыны”, “Град”, “Што ты спіш?..” і інш. Радзей паўтор пытальных сказаў складае ўвесь твор, як у вершах “Чаго б я хацеў”, “Бяспутнасць”, 6-ая частка “З песень беззямельнага” і інш., але тады гэта, як, напрыклад, верш “Эй, скажы, мужычок!..”, – узор адметнай формы пабудовы ўсяго тэксту, які, па сутнасці, складаецца з рада пытальных сказаў, якія ў пытальнай інтанацыі і паведамляюць, нясуць пэўную інфармацыю. Так, у названым вершы, з сямі строф толькі першая і апошняя пачынаецца галоўнай часткай складанага сказа “*Эй, скажы, мужычок...*” і “*Дык скажы, мужычок*” адпаведна, а астатнія – гэта толькі пытанні. Для ілюстрацыі прывядзем толькі дзве першыя страфы:

*Эй, скажы, мужычок,*
*Дзе ты долю падзеў? –*
*Ці ўтапіў ў ручаёк,*
*Ці прапіў, ці праеў?*

*Ці змарозіў ў мароз?*
*Ці у лапцях стаптаў?*
*Ці на рынак завёз, –*
*На хлеб дзецям прадаў?* (I, 209).

Усяго ж у вершы 21 пытальны сказ, усе яны адрасуюць унутранае маўленне лірычнага героя да сябе (дыялог з сабой) і разам з тым да субяседніка (дыялог з кожным, з цэлым светам), а часціца *ці* з`яўляецца сродкам выдзялення кожнага новага пытання, анафарычным элементам-звязкай тэксту, адзінкай узмацнення пытальнага характару выказвання.

Зразумела, што не заўсёды паўтор пытальных сказаў выконвае названыя функцыі ў “чыстым” выглядзе, пытанні-паўторы часцей сумяшчаюць некалькі функцый. Напрыклад, першыя дзве страфы ў вершы “Каму вас, песні?..” – нагнятанне пытанняў, якія перадаюць разважанні паэта пра адрасаванасць паэтычных твораў, ці для каго паэт будзе пісаць вершы-песні (медытацыйная функцыя), прапануюць выбар з прыведзеных магчымых адрасатаў паэзіі(альтэрнатыўная функцыя) і разам з тым даюць інфармацыю для разважання і акцэнтуюць увагу на галоўным – для адных ці другіх пець песні (сэнсава-выдзяляльная функцыя):

*Каму вас, песні, я нясмелы*
*Тут буду пець, снаваць з душы,*
*З душы няшчаснай, набалелай,*
*Аж, змучан, згіну дзе ў глушы?*

*Ці для тых цёмных, нешчаслівых,*
*Што не патрапяць прачытаць,*
*Ці для тых светлых, а зласлівых,*
*Што не захочуць вас і знаць?* (“Каму вас, песні?..”, I, 171).

Ці, напрыклад, у пачатку верша “Памяці С. Палуяна” паэт ставіць рад пытанняў, якія перадаюць яго эмоцыі ў сувязі з смерцю сабрата па пяру, яго перажыванні (эматыўная функцыя) і адначасова яго разважанні (медытацыйная), адрасаваныя сваім зместам для ўсіх і кожнага (інфармацыйная):

*Куды ідзём?.. куды праклятце нас вядзе?*
*Якія далі здабываем?*
*Дзе гарт, надзея, вера ў будучыну – дзе?*
*Чым сэрцы, думы акрыляем?*

*Няшчасны край! чым быў, чым стаў, чым будзеш ты*
*З сваім прыдаўленым народам?*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Як нёс – нясеш ярмо упадку, слепаты*
*І змен чакаеш год за годам.* (“Памяці С. Палуяна”, II, 129).

Ужыванне тут займенніка *нас* у першым радку першай страфы і дзеясловаў цяперашняга часу ў форме 1-ай асобы множнага ліку (*ідзём, здабываем, акрыляем*) падкрэслівае аб`яднанне апавядальніка (лірычнага “*я*”) з адрасатам вершаванага маўлення (*мы* разам, *мы* адзінае цэлае – паэт і народ).

У залежнасці ад месца ў страфе, вершы, ад зместу, функцыі, якую выконваюць пытальныя сказы ў паэзіі, на матэрыяле паэтычных тэкстаў Янкі Купалы можна выдзеліць і рознага тыпу паўторы-пытанні. Сярод іх пытанні-развažанні аўтара ці яго лірычнага героя, напрыклад:

*Ці ж нас такое зроду ўжо праклляцце*
*Зачаравала чарамі сваімі,*
*Што мусім мы пад вокнамі стагнаці,*
*Губляці пад крыжамі сваё імя,*
*Й не знаючы век бацькаўшчыны-маці,*
*У ёрмах валачыцца між чужымі?..*
*Ці ж нам ніколі ўжо прасветласці не знаць –*
*Гібець, гнісці й, не жывучы, канаць?* (“Валачобнікі”, III, 201),

пытанні-вывады, напрыклад:

*На вялікім свеце ўсё ідзе па праву,*
*Па законе божым, з яснатой яскравай...*
*А ў нас, у нас што?.. Толькі звоняць путы...* (“На вялікім свеце...”, III, 80),

пытанні-воклічы, напрыклад:

*Докуль, о Божа, ты гневацца будзеш маўчком?*
*Хутка ж твая ўспаланее заўзятасць агнём?!* (“На біблейныя матывы”, IV, 91),

пытанні-рэфрэны, напрыклад:

*Ці ты ўзойдзеш калі, сонца?* (“Ці ты ўзойдзеш калі, сонца?”, II, 162),

пытанні-заклікі, напрыклад:

*Дзе ты, доля, дзе ты, воля?*
*Не знаць, не чуваць;* (“Па жыццёвай пуцявіне”, I, 189),

пытанні-характарыстыкі, напрыклад:

*Ці дзявочы ручкі звялі ў бядзе?*
*Ці ж нікога не галубяць нідзе?* (“Мусіць трэба было”, IV, 21),

пытанні-кантакты, напрыклад:

*Грай жа, музыка! Рэж, дармажэрца!..*
*Змоўк?.. Што?.. Галоўку ты клоніш ка сну?..* (“Грай жа, музыка...”, III, 74) і інш., але ўсе яны ўтрымліваюць інфармацыю, заклікаюць да роздуму, спыняюць увагу, выражаюць пачуцці – з’яўляюцца паэтычнымі сродкамі размоўнага сінтаксісу.

Такім чынам, ужыванне пытальных сказаў у паэтычных тэкстах мае шэраг адметнасцей, што, з аднаго боку, абумоўлена спецыфікай гэтага роду тэкстаў, а з другога – з’яўляецца прыкметай яе выражэння. Па-першае, гэта паўтор пытанняў, па-другое, іх абавязковая адрасаванасць – унутраны і знешні адрасат (да сябе, уяўнага адрасата, да Бога), па-трэцяе, як вынік дзвюх папярэдніх адметнасцей – разнастайнасць функцый у тэксце, калі пытанні-паўторы інфармуюць, дазваляюць даведацца пра меркаванні паэта, прымушаюць ці вядуць да роздуму, засяроджваюць сваім зместам і афармленнем на сабе ўвагу, выражаюць пачуцці, падкрэсліваюць асноўнае, уздзейнічаюць на ўспрыманне, з’яўляюцца сродкамі тэкстаўтварэння. Разам з тым паўторы-пытанні выяўляюць адну з адметнасцяў ідыястылю мастака, у прыватнасці для паэзіі Янкі Купалы найбольш характэрна ўжыванне паўтору пытанняў як імітацыі жывога народнага маўлення, у выніку чаго выяўляецца магчымасць акцэнтаваць увагу, узняць праблему, выразіць роздум, апеляваць да магчымасці выбару чытачом, уздзейнічаць на яго і інш.

**Abstract.** The paper reveals the peculiarities and functional variety of the use of interrogative sentences in poetry on the material of poetic works by Yanka Kupala.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Літаратура**

1. Бахтин, М. Вопросы литературы и эстетики / М. Бахтин. – Москва: Художественная литература, 1975. – 502 с.
2. Ковтунова, И.И. Поэтический синтаксис / И.И. Ковтунова. – М.: Наука, 1986. – 206 с.
3. Бахтин, М.М. Проблема текста в лингвистике, филологии и других гуманитарных науках / М.М. Бахтин // Литературно-критические статьи. – М.: Художественная литература, 1986. – С. 473–500.
4. Тут і далей у дужках указваецца назва твора, том і старонка па выданні: Купала, Янка. Поўны збор твораў у дзевяці тамах / Я. Купала. Мінск: Мастацкая літаратура, 1995–2003.
5. Старченко, А.А. Семантика вопроса в естественном языке / А.А. Старченко, М.В. Волченко // Логико-методологические исследования / Под ред. А.А.Старченко. – Москва: МГУ, 1980. – С. 265–286.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 03.06.08

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ